


ЯК ЗРАБІЦЬ ПРЫШЧЭПКУ МОДНАЙ? 3

«МЫ ВЫГАНЯЕМ ДЗЯЦЕЙ НЕ НА ВУЛІЦУ» 9





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СЕРАДА № 197 (29566)


## КОРАТКА

- **Беларусь у рэйтынгу паштовага развіцця ўзначаліла рэгіянальную групу краін Усходняй Еўропы і СНД.**
- Увод у эксплуатацыю другога энергаблока БелАЭС плануецца ў 2022 годзе.
- **Стары замак у Гродне адкрыюць для наведвальнікаў у пачатку лістапада.**
- На паўднёвым захадзе Брэста пабудуюць новы мікрараён.
- **БРСМ і БСЖ правядуць вучэбны інтэнсіў для валанцёраў «COVID-патруля».**
- Фестываль-кірмаш «Берасцейскія сані» плануюць правесці ў зімовыя святы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Беларусь узяла курс на павышэнне энергаэфектыўнасці і энергазберажэнне. Дзякуючы ўвазе кіраўніка дзяржавы да гэтых пытанняў і дзяржаўнай падтрымцы гэтага напрамку энергаёмістасць ВУП нашай краіны за апошнія 10 гадоў знізілася ў 1,2 раза. Гэта істотны ўклад ва ўмацаванне энергабяспекі, паляпшэнне экалогіі, павышэнне якасці жыцця людзей. Работа па далейшым укараненні інавацыйных тэхналогій, эфектыўным выкарыстанні традыцыйных энергарэсурсаў і альтэрнатыўных, невуглевадародных крыніц энергіі ў Беларусі будзе працягнутая. Найважнейшы прыярытэт — развіццё атамнай энергетыкі».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «Гэта як прыняцце новай Канстытуцыі»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора сабраў нараду па абмеркаванні пытанняў заканадаўства ўдасканалення нацыянальнай сістэмы адукацыі**



Фота БелТА.

**Абмеркаваць на ўзроўні кіраўніка дзяржавы новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі і змяненні ў правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы дамовіліся яшчэ 24 жніўня на Рэспубліканскім педагагічным савеце. Праект кодэкса быў прыняты дэпутатамі ў першым чытанні і падрыхтаваны да разгляду ў другім. Па даручэнні Прэзідэнта на нараду запрошаны прадстаўнікі нацыянальнай сістэмы адукацыі, у тым ліку з рэгіёнаў, з глыбінкі, як тэарэтыкі, так і практыкі, а таксама эксперты.**

СТАР. 2

# Працоўна-аглядная пляцоўка






Машыніст экскаватара будаўніча-мантажнага ўпраўлення «Навагрудскае» Сяргей ЖУРКО са сваей арганізацыяй прымае самы актыўны ўдзел у рэстаўрацыі сярэднявечнага замка: яму даручана замацаванне земляного вала пад галоўнай замкавай вежай. З гэтага вала адкрываецца дзівосная панарама на гарадскую планіроўку, навакольныя вуліцы, знакаміты касцёл. Сяргей часта прыходзіць на Замкавую гару, яму падабаецца ўглядацца ў далёкія абрысы маляўнічых ландшафтаў, у знаёмыя абліччы архітэктурных камяніц. Ён не хавае гонару, што і ад яго працы залежыць захаванне нашай культурна-гістарычнай спадчыны.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Жывіце ў бяспецы



# ДОБРЫХ СПРАЎ — БЕЗЛІЧ...

**Ратавальнікі па ўсёй краіне дапамагаюць адзінокім пажылым людзям і разам з тым нагадваюць ім аб правілах бяспечнай жыццядзейнасці**

**У восеньскі час заўжды хапае работы. Мала сабраць ураджай і падрыхтаваць да першых маразоў жыллё, што асабліва актуальна для тых, хто плануе зімаваць у сельскай мясцовасці. На прысядзібным участку кожны дзень — новая работа: то лісце трэба сгрэбсці, то сухія галіны на дрэвах спілаваць, то пазбавіцца ад непатрэбнага смецця...**

СТАР. 4

# «Гэта як прыняцце новай Канстытуцыі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разгляд найбольш важных актаў заканадаўства ў шырокім коле ў Прэзідэнта даўно стаў традыцыяй. «Карэкціроўка кодэкса і правіл прыёму ў адукацыі — гэта як прыняцце новай Канстытуцыі, толькі, зразумела, у гэтай сферы. Нам і нашым дзецям па іх жыць, вучыцца і працаваць. І галоўнае пры гэтым — не нашкодзіць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што за апошнія гады ў краіне многае зроблена ў сістэме адукацыі: створана неабходная заканадаўчая база, забяспечваецца стабільнае фінансаванне, навучэнцам і педагогам аказваецца сацыяльная падтрымка. «І аддачу ад гэтага мы бачым. Вялікіх прэтэнзій да галіны няма», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы пры гэтым неабходнасць далейшага павышэння даступнасці і якасці адукацыйных паслуг.

Запланаваныя навоўвядзенні былі падрабязна абмеркаваны на Рэспубліканскім педагагічным савеце. Паралельна праводзіліся грамадскія абмеркаванні і дыялогавыя пляцоўкі, дзе не толькі прапрацоўваліся прапанаваныя Міністэрствам адукацыі навелы, але і фіксаваліся ініцыятывы ад педагогаў, бацькоў, усіх зацікаўленых. «Словам, нібыта аб'ёмная работа праведзена. Хацелася б даведацца, ці ўсе прапановы ўлічаны ў ходзе падрыхтоўкі кодэкса і правіл прыёму. Калі не, то чаму? І ***галоўнае маё патрабаванне як кіраўніка дзяржавы — справядлівае стаўленне да кожнага чалавека, забеспячэнне роўных магчымасцяў для атрымання адукацыі***, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вось у плане справядлівасці тут ужо нікуды не дзенешся. Гэта першыя крокі нашых будучых грамадзян. Таму гэтыя першыя крокі павінны быць сумленнымі, прыстойнымі і справядлівымі ў абстаноўцы сумленнасці і справядлівасці».

«Мы разумеем, што свет мяняецца вельмі хутка і наша сістэма адукацыі павінна таксама аператыўна прыстасоўвацца да павеваў часу», — адзначыў беларускі лідар.

Не менш актуальнае, паводле яго слоў, пытанне: наколькі гатова беларуская сістэма адукацыі да новых падыходаў, якія закладваюцца ў кодэкс і правілы прыёму. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за змяненнямі важна не страціць магчымасці ўбачыць кожнага абітурыента. «Давайце вызначымся, як мы будзем прымаць у ВНУ людзей: або мы захаваем цяперашнюю сістэму, што прасцей за ўсё, або мы яе істотна мадэрнізуем. Мяне насцярожвае толькі адно: за гэтым цэнтралізаваным тэсціраваннем не заўсёды бачым чалавека. Гэта небяспечна», — лічыць Прэзідэнт.

«Я хачу вас сарыентаваць на шчыры дыялог, паколькі ў сістэме адукацыі дробязяў не бывае. Справа ў тым, што мы ўжо не можам дапусціць ніякіх памылак. Сістэма вызначае ў тым ліку развіццё эканомікі краіны, яе ўстойлівасць да сусветных выклікаў. А гэта ўжо пытанні забеспячэння нацыянальнай бяспекі, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — І яшчэ раз: школа павінна быць школай — гэта храм. Усё гэта ў кодэксе павінна быць адлюстравана».

**Паводле БелТА.**

## Каментарый у тэму

## Змены для абітурыентаў і першакласнікаў

**По выніках нарады міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА расказаў журналістам аб яе ключавых момантах**

Новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі і правілы прыёму ў ВНУ і ССНУ канцэптуальна падтрыманы, паведаміў ён. «Нам даручана ў профільнай камісіі ў рамках рабочай групы яшчэ раз паглядзець на кодэкс пры падрыхтоўцы да другога чытання. Ёсць некаторыя тэхнічныя праўкі, якія ў найбліжэйшы час мы адрэгулюем. А ў цэлым кодэкс гатовы да разгляду. Правілы прыёму фактычна сёння ўжо ўзгоднены з усімі зацікаўленымі і ў найбліжэйшы час будуць унесены кіраўніку дзяржавы ў выглядзе адпаведнага ўказа на падпісанне», — дадаў міністр.

Таксама ён распавёў, што сумешчаны з цэнтралізаваным тэсціраваннем адзіны экзамен у школах плануецца ўвесці з 2023 года. «Мы доўга спрачаліся, будзем уводзіць гэта з 2022 года або з 2023-га. І прыйшлі да высновы, што ўсё-такі з 2023-га ўводзіць, каб даць восьі гэты год на адаптацыю», — сказаў міністр.

А вось залічэнне ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі прапануецца праводзіць без цэнтралізаванага тэсціравання па конкурсе дакумента аб адукацыі. Пры гэтым пры прыёме ў ВНУ адмаўляцца ад правядзення ЦТ не будуць, аднак будзе скарыстаны камбінаваны падыход. «Чаму не сыходзім — таму што пры ўсіх плюсах і мінусах цэнтралізаванага тэсціравання мы ўсё ж такі вырашылі карупцыйную праблему. І за апошнія гадоў дзесяць не ведаем нейкіх гучных скандалаў, звязаных з уступнай кампаніяй. Вось гэта мы страціць не павінны», — адзначыў Ігар Карпенка.

Усе гэтыя змены пачнуць дзейнічаць не адразу. Для тых, хто паступае ў 2022 годзе, пакуль нічога істотна не зменіцца, запэўніў Ігар Карпенка. «Можа быць, за выключэннем пашырэння мэтавага набору. Магчыма, будуць пашыраныя некаторыя льготы (у залежнасці ад таго, як будзе прыняты нарматыўны акт) для ўдзельнікаў алімпіяд», — заявіў міністр.

Закрануў ён у размове з журналістамі і надзённую тэму дыстанцыйнага навучання. «Мы павінны разумець, што дыстанцыйная форма не зможа замяніць традыцыйную падрыхтоўку па ўсіх спецыяльнасцях вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Уся прафесійная адукацыя ў нас практыка-арыентаваная. А калі мы гаворым аб вышэйшай адукацыі, то са спалучэннем яшчэ і фундаментальнай падрыхтоўкі», — адзначыў міністр, задаўшы рытарычнае пытанне, як, напрыклад, можна дыстанцыйна падрыхтаваць медыка. Разам з тым і ў гэтай сферы могуць быць задзейнічаны элементы дыстанцыйнай адукацыі. «Хутчэй за ўсё, гэтыя дыстанцыйныя формы будуць развівацца. Мы не выключаем, што па некаторых відах адукацыі можа з'явіцца самастойная форма дыстанцыйнай падрыхтоўкі. Напрыклад, па гуманітарных спецыяльнасцях. Можа быць, па некаторых спецыяльнасцях перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі», — сказаў Ігар Карпенка, удакладніўшы, што адпаведныя нормы, якія датычацца дыстанцыйнай формы навучання, закладзены ў разгляданую новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі.

Абмяркоўвалася на нарадзе і тэма ўзросту, з якога дзяцей можна залічаць у школу. «У нас паўстала спрэчка па шасцігодках, якія ідуць у школы і якім на пачатак вучэбнага года не хапае месяца ці паўтара для залічэння. Такія пытанні ўзнікаюць. Мы яшчэ гэтыя нюансы адпрацуем, паглядзім, як лепш запісаць. У прынцыпе пярэчанняў такіх не было. Калі дзіця гатова да школы — гэта вызначаецца, як правіла, педкалектывам на месцах, — мы паглядзім, як адрэгуляваць гэтыя пытанні», — падсумаваў міністр.

Кантэкст

# КАЛЮЧЫ ДРОТ ЗАМЕСТ СПАЧУВАННЯ

**Днямі стала вядома, што афіцэры пагранічнага агенцтва ЕС (Frontex) зафіксавалі як мінімум 14 выпадкаў «групавога выціскання мігрантаў» з тэрыторыі Літвы. Пра гэта заявіла назіральнік Frontex па фундаментальных правах Катажына Венцэль, паведаміў літоўскі тэлеканал LRT. Прычым гаворка ідзе пра паведамленні «аб сур'ёзных інцыдэнтах», заявіла Катажына Венцэль. Паводле яе слоў, у справаздачах Frontex гаворыцца аб «практыцы калектыўных выціскаянняў» мігрантаў з літоўскай тэрыторыі. «Афіцэры Frontex не маюць прамога дачынення да так званага перанакіравання людзей», — адзначыла яна.**

Праваабарончыя арганізацыі ў ЕС прытрымліваюцца думкі, што выціскванне мігрантаў з пагранічнай тэрыторыі Літвы парушае палажэнні Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека. Улады Літвы пакуль не агучылі пэўнай інфармацыі ў сувязі са справаздачай Frontex. Так, кіраўнік літоўскай Службы аховы дзяржграніцы Рустамас Любаевас паведаміў, што Літва сумесна з Frontex праводзіць праверку некалькіх справаздач агенцтва, якія датычацца групавога выціскання мігрантаў, паведаміла Delfi. Міністр унутраных спраў Літвы Агнэ Білатайтэ паведаміла, што ёй не давялося азнаёміцца з прадстаўленай Frontex інфармацыяй, аднак яна лічыць, што службовыя асобы Літвы дзейнічаюць у адпаведнасці з прадугледжаным у нацыянальным праве парадкам.

Іншага пункту гледжання прытрымліваюцца эксперты сусветных арганізацый. Меры Літвы па ўрэгуляванні міграцыйнага крызісу парушаюць (!) нацыянальнае і міжнароднае права, заявіў прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара (УВКБ) ААН па справах бежанцаў у краінах Паўночнай Еўропы і Балтыі Хенрык М. Нордэнтофт. Аб гэтым паведаміў партал Baltnews.

У ААН адзначаюць, што вяртанне мігрантаў праз граніцу не толькі пагражае жыццю людзей, але і з'яўляецца незаконным. «Прыстанішча з'яўляецца адным з асноўных правоў чалавека. Мы заклікаем Літву выконваць свае міжнародныя абавязацельствы, даючы асобам, якія шукаюць прыстанішча, магчымасць атрымаць яго і забяспечваць адпаведныя ўмовы прыёму і эфектыўную працэдуру прадастаўлення прытулку», — заявіў Хенрык М. Нордэнтофт.

Асаблівую заклапочанасць міжнароднай супольнасці выклікаюць умовы, у якіх утрымліваюцца мігранты ў прыгранічных раёнах. Так, бежанцы часта пражываюць у закрытых і надзвычай густанаселеных раёнах без належных умоў. Некаторыя групы ўтрымліваліся такім чынам больш за тры месяцы, адзначыў прадстаўнік ААН. З набліжэннем зімы сітуацыя становіцца асабліва складанай.

І яшчэ адна, на мой погляд, адметная інфармацыя. Стала вядома, што Літва перакідвае бежанцаў з лагераў у іншыя краіны ЕС. Пра гэта БелТА паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. Міністэрства ўнутраных спраў Літвы 29 верасня афіцыйна заявіла аб тым, што больш за 700 нелегальных мігрантаў з пачатку 2021 года збегла з цэнтраў размяшчэння ў гэтай краіне. «Выдатна разумеючы, што Літва не з'яўляецца канчатковым пунктам прызначэння і мігранты імкнуцца ў больш багатыя краіны, такія як Германія, Аўстрыя і Бельгія, літоўскі бок імітуе ўцёкі. Іншымі словамі, спрыяе перакідвы мігрантаў углыб Еўрапейскага саюза, — распавялі ў ведамстве. — Масавыя ўцёкі немагчымыя з прычыны ўтрымання бежанцаў пад узмоцненай кругласутачнай узброенай ахоўай паліцыі і вайскоўцаў. У ахове выкарыстоўваюцца службовыя сабакі. Гэтыя так званыя лагеры абсталяваныя агароджамі, калючым дротам і тэхнічнымі сродкамі аховы. Такім чынам, мігранты не маюць магчымасці пакінуць тэрыторыю цэнтраў утрымання без іншага садзейнічання».

**«Прыстанішча з'яўляецца адным з асноўных правоў чалавека. Мы заклікаем Літву выконваць свае міжнародныя абавязацельствы, даючы асобам, якія шукаюць прыстанішча, магчымасць атрымаць яго...»**

Імітацыя Літвой уцёкаў мігрантаў з лагераў — гэта шантаж такіх дзяржаў, як Германія, Францыя, Аўстрыя і іншых. Такім меркаваннем з карэспандэнтам БелТА падзяліўся **загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН, кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН.** «Ім трэба паспець да рэферэндуму ў Беларусі разыграць чарговую геапалітычную карту супраць і Беларусі, і Саюзнай дзяржавы. У адваротным выпадку цяжка будзе растлумачыць сваёй грамадскасці з'яўленне трупаў ад холаду ў кватэрах і дамах і голаду ў сувязі са штучна створаным крызісам. Паводле папярэдніх даных, калі не зменіцца сітуацыя, амаль 80 мільёнаў грамадзян ЕС не проста пазамярзае, а некаторыя з іх могуць не выжыць. Напрыклад, у Вялікабрытаніі штогод ад холаду гіне каля 20 тысяч чалавек. Грамадзянам Беларусі, думаю, ёсць з чым параўнаць. Заходняя дэмакратыя пераўтварыла свае народы ў вязняў сумлення», — рэзюмаваў эксперт.

Ён таксама нагадаў, што 5 кастрычніка зноў за 500 метраў ад граніцы з Літвой быў знойдзены труп бежанца — грамадзяніна Шры-Ланкі. «На жаль, па CNN такое не пакажуць — гэта іншае. Узнікае пытанне да так званай дэмакратычнай еўрапейскай супольнасці: колькі яшчэ трэба трупаў для разумення непазбежнага пакарання злачыннай улады Польшчы і Літвы? Няўжо не зразумела брусельскім чыноўнікам, што беспакаранасць і ўкрывальніцтва злачынстваў сваіх сатэлітаў паскарае развал, а разам з тым і пагаршае трагедыю для народаў Еўропы?

Ужо зразумела, што на гэтым трупы не закончацца. Польскія і літоўскія ўлады з падачы Вашынгтона вырашылі ісці да канца і ўкараніць тэхналогію па фізічным знішчэнні для сябе, як яны палічылі, лішніх людзей», — падкрэсліў Мікалай Шчокін.

Яшчэ адно меркаванне прагучала падчас Нобелеўскага тыдня. Еўропа павінна сустракаць мігрантаў са спачуваннем, а не з калючым дротам. Пра гэта ў інтэрв'ю Reuters заявіў пісьменнік Абдулразак Гурна, узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй 2021 года па літаратуры. Паводле яго слоў, дзіўныя рашучасць і смеласць людзей, якія выпраўляюцца ў далёкае падарожжа, каб збегчы са сваіх краін для новага жыцця. «Вы павінны задаць пытанне: што такога жудаснага ў тым месцы, дзе яны знаходзяцца, што яны ідуць на такую рызыку?» — заўважыў пісьменнік. Ці пачуюць?

**Пётр ДУНЬКО.**

**Уладзімір МАКЕЙ:**

# «Нарастае дыктат сілы»

**Гэтымі днямі ў Нур-Султане праходзіць 6-я сустрэча міністраў замежных спраў краін — членаў Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі. Удзел у канферэнцыі бярэ і беларуская дэлегацыя на чале з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Уладзімірам Макеем.**

Выступаючы падчас нарады Уладзімір Макей заявіў, што ў сучасным свеце нарастае дыктат сілы, пашыраецца практыка санкцыйнага пакарання «непакорлівых» краін. Беларусь у поўнай меры адчувае на сабе негатыўныя наступствы такога «новага сусветнага парадку». «Пандэмія агаліла супярэчнасці сучаснай цывілізацыі, стварыла новую геапалітычную рэальнасць. Праявы блокавага мыслення і нацыянальнага эгаізму, ксенафобіі, карысліва-эгаістычнага ігнараванне нормаў міжнароднага права — вось тыя сумныя рэаліі, з якімі сутыкнулася наша планета», — канстатаваў ён.

Міністр таксама адзначыў: «Пад прыкрыццём гучных лозунгаў аб абароне правоў чалавека знешнія сілы паспрабавалі рэалізаваць у нашай краіне ўласныя геапалітычныя праекты, змяніць на сваю карысць баланс сіл у рэгіёне, стварыць на геапалітычным стыку інтарэсаў Захаду і Усходу яшчэ адзін падпалены ачаг нестабільнасці».

«Аднак нічога з гэтага не выйшла і не выйдзе, — заявіў кіраўнік МЗС. — Ірак і Лівія, Сірыя і Афганістан перакана́ўча паказваюць, што неакаланіяльныя метады ў знешняй палітыцы сеюць толькі хаос і разбурэнне, прыносяць гора і пакуты цэлым народам, становяцца прычынай росту патокаў бежанцаў і мігрантаў у сытую Еўропу».

Беларусь жа разглядае ўзаемадзеянне з краінамі Азіі ў якасці прыярытэту сваёй знешняй палітыкі. «Тут цесна пераплеценыя гандлёва-эканамічныя сувязі з нашымі партнёрамі па Еўразійскім саюзе. З'яўляючыся членам Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, наша краіна зацікаўленая ва ўмацаванні калектыўнай бяспекі Цэнтральна-Азіяцкага рэгіёна», — сказаў кіраўнік беларускага МЗС.

«Беларусь заўсёды зыходзіла з неабходнасці вырашэння ўсіх спрэчак і канфліктаў дыпламатычнымі метадамі, заўсёды была адданая раўнапраўнаму дыялогу, але абсалютна не прымае дыктату і ціску», — падкрэсліў кіраўнік МЗС. «На фоне нарастаючай канфрантацыі ў свеце асабліва актуальныя словы легендарнага міністра замежных спраў СССР Андрэя Грамыкі: «Лепш дзесяць гадоў перагавораў, чым адзін дзень вайны». Сучасны свет занадта кволы і ўзаемазалежны, каб будаваць у ім свой дабрабыт за кошт іншых», — лічыць Уладзімір Макей.

Ён перакананы, што з улікам зрушэння фокусу глабальнай палітыкі і эканомікі на Азію, дынамічнага развіцця трансканцінентальных гандлёва-эканамічных сувязяў, панеўразійскіх інфраструктурных і лагістычных праектаў як ніколі актуальнае далейшае пашырэнне дыялогу і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі — удзельніцамі Нарады і павышэнне статусу гэтага форуму на міжнароднай арэне.

Рэха падзеі

# ПЕРШЫ КРОК ДА ПРАФЕСІІ

**У Акадэміі МУС адбыўся дзень адкрытых дзвярэй**

**Гэтым разам галоўная міліцэйская ВНУ Беларусі сустракала гасцей амаль з усіх рэгіёнаў краіны. Для таго, каб абітурыенты максімальна пазнаёміліся з будучай прафесіяй, на базе Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў разгарнулі экспазіцыі мінская Дзяржаўтаінспекцыя, Следчы камітэт, а таксама Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз — у тым ліку ў іх інтарэсах навучальная ўстанова рыхтуе кадры.**



Супрацоўнікі, якія прадстаўлялі свае ведамствы, з цяжкасцю паспявалі адказваць на пытанні, якія паступалі ад школьнікаў і іх бацькоў. Акрамя таго, апошнія ўважліва знаёміліся з тэхнічнымі навінкамі, з якімі, калі ўсё атрымаецца, будуць працаваць іх дзеці. Максімальна акунуцца ў прафесію хлопцам і дзяўчатам дапамаглі перасоўны сітуацыйна-апаратыўны штаб, лабараторыя следчых, перасоўная экспертна-крыміналістычная лабараторыя, службовыя аўтамабілі ДАІ. Прадстаўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, у сваю чаргу, падрыхтавалі для моладзі іспыт на веданне Правілаў дарожнага руху. У акадэміі разгарнулася выстаўка ўзбраення і спецыяльных сродкаў, пункты дактыласкапіі і фіксацыі слядоў злачынства. Абітурыенты патрэніраваліся здымаць адбіткі пальцаў, паспрабавалі скласці фотапартрэт правапарушальніка.

Начальнік Акадэміі МУС генерал-маёр міліцыі Аляксандр Васільеў, а таксама яго намеснік палкоўнік міліцыі Аляксей Башан падрабязна расказалі аб асаблівасцях паступлення ў ВНУ, пазнаёмілі са спецыяльнасцямі і спецыялізацыямі, абазначылі, якая служба чакае выпускнікоў пасля заканчэння навучальнай установы. Завяршыўся дзень адкрытых дзвярэй экскурсіяй па акадэміі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва Акадэміі МУС.**

Рэгіёны

# Як зрабіць прышчэпку моднай?

**На поўначы краіны, дзе першымі адчулі «ўдар» каранавіруса, актывізавалі агітацыю і тэмпы прышчэпачнай кампаніі.**

«Уколы» можна зрабіць не толькі ў паліклініках, гандлёвых цэнтрах, але і ў іншых месцах. А мабільныя брыгады медыкаў (на сёння ў Падзвінскім краі іх каля пяцідзесяці) робяць прышчэпкі дома, у прыватнасці, людзям з абмежаванымі магчымасцямі першай і другой груп. Могуць адкрыць і часовы «прышчэпачны пункт» на тэрыторыі прадпрыемства, арганізацыі, калі кіраўнік калектыву накіруе ў медыцынскую ўстанову адпаведную просьбу. Магчымасць прышчапіцца па месцы работы вельмі папулярная, як увогуле — па-за медыцынскімі ўстановамі.




**Калектыў Глыбоцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва падчас эстафеты «Мы вакцынаваныя».**

У Наваполацку днямі з'явілася магчымасць прышчапіцца ў адным з ЖЭСаў, а таксама ў выставачнай зале музея гісторыі і культуры горада. Адзінае, што трэба прад'явіць медыкам, — пашпарт.

Іншаземцы платна могуць прышчапіцца ў дзясятку пунктаў вакцынацыі: у абласным цэнтры, Полацку, Наваполацку, Оршы, Глыбокім, Лепелі, Верхнядзвінску, Браславе.

Цікавы прыклад мясцовай ініцыятывы — ад рэдакцыі раённай газеты «Веснік Глыбоччыны», якая стала ініцыятарам правядзення эстафеты «Мы вакцынаваныя». На сайце рэдакцыі можна ўбачыць «фотасправаздачы» з выявамі тых, хто ўжо прышчапіўся. У руках удзельнікаў эстафеты аркушы з назвай акцыі. Фота адпраўляюць у рэдакцыю па электроннай пошце. Потым іх можна ўбачыць і ў папяровай версіі газеты. Андрэй Панкрат, галоўны рэдактар «Весніка Глыбоччыны», канстатуе, што эстафета знайшла жывы водгук сярод жыхароў раёна.

Першымі прышчапіліся стваральнікі газеты, яны перадалі эстафету работнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, тыя — супрацоўнікам Глыбоцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва...

Усё менш людзей, якія настроены катэгарычна супраць прышчэпак. «Папулярызатарам» стаў сам вірус, бо цяжка знайсці ў краіне чалавека, чые б сваякі, сябры, калегі не перахварэлі. Тым не менш да вакцыны сярод значнай часткі насельніцтва захоўваецца недавер. Жыхары Падзвінскага краю — аўтсайдары ў пытанні вакцынацыі. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў канстатаваў, што вакцынацыя зроблена толькі 21 % насельніцтва. Ён патрабаваў ад сваіх падначаленых набраць тэмп у прапагандзе мэтазгоднасці медыцынскай прафілактыкі новай хваробы.

Кіраўніцтва мясцовай улады ўвесь час нагадвае людзям пра неабходнасць прышчапляцца, тлумачыць важнасць мер бяспекі, каб мінімізаваць рызыку інфіцыравання ў грамадскіх месцах. Абавязковае нашэнне маскі, сацыяльная дыстанцыя (калі гэта магчыма) — насамрэч трэба не вельмі шмат, каб мінімізаваць рызыку заразіцца і заразіць.

Зразумела, што чым менш людзей захварэе, тым меншая нагрузка будзе на медыцыну, тым большая частка насельніцтва будзе працаваць, а не знаходзіцца на бальнічным. Пахваліў губернатар за клопат пра людзей кіраўніцтва УП «Віцебскаблгаз», дзе амаль усіх пераканалі зрабіць прышчэпкі. У лідарах па колькасці прышчэпленых — калектывы структур сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (каля 90 %) і медыкі (прыкладна 85 %).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Катар адмовіўся вяртацца ў АПЕК



Краіна не мае намеру вяртацца ў Арганізацыю дзяржаў — экспарцёраў нафты, паколькі спробы паўплываць на сусветныя цэны на «чорнае золата» не адпавядаюць яго стратэгіі, заявіў міністр энергетыкі краіны Саад Аль-Каабі. Пра гэта паведаміла Bloomberg. Эмірат быў членам Арганізацыі краін — экспарцёраў нафты з 1961-га. Катар вырашыў выйсці з картэля ў канцы 2018 года, заявіўшы, што яго выхад быў «тэхнічным» і пытаннем стратэгіі, паколькі Доха пераключыла сваю ўвагу на прыродны газ у якасці асноўнай экспартнай пазіцыі. Тады катарскія ўлады заявілі, што гэтае рашэнне не было простым для краіны, улічваючы 57 гадоў членства ў АПЕК. Тым не менш вяртацца Доха не спяшаецца. Назіральнікі бачаць прычыну адмовы ад удзелу ў нафтавым картэлі ў канфлікце паміж Катарам і некаторымі яго суседзямі.

## Генеральны сакратар ААН заявіў аб росце ўзроўню жабрацтва ў свеце



Пандэмія COVID-19 прывяла да жабрацтва больш чым 100 мільёнаў чалавек, звыш 4 млрд практычна не мае сацыяльнай падтрымкі. Аб гэтым заявіў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш на мерапрыемстве МВФ, прысвечаным аднаўленню дзяржаў ад пандэміі каранавіруса, паведаміла РІА «Навіны». Паводле яго слоў, няроўнасць у пытанні размеркавання вакцын выракае свет на мільёны новых смерцяў і падаўжае эканамічны спад, які можа абысціся ў трыльёны долараў і больш за ўсё ўдарыць па бедных краінах. «Нам патрэбны смелы калектыўны рывок, каб палажыць канец пандэміі і забяспечыць устойлівае і ўсёабдымнае аднаўленне сусветнай эканомікі», — падкрэсліў генеральны сакратар.

## ААЭ абвясцілі пра намер высадзіцца на астэроід



Аб'яднаныя Арабскія Эміраты рыхтуюць новую амбіцыйную касмічную місію ў пачатку 2030-х гадоў. У дадзеных мэтах да пояса астэроідаў, якія знаходзяцца паміж арбітамі Марса і Юпітэра, будзе накіраваны зонд. Аб гэтым паведаміў кіраўнік Дубая і прэм'ер-міністр Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў (ААЭ) Мухамад бен Рашыд Аль Мактум, якога цытуе мясцовае тэлебачанне. Старт праекта ў 2028-м будзе прымеркаваны да 50-годдзя незалежнасці дзяржавы і разлічаны на пяць гадоў, удакладніў ён. За гэты час трэба будзе распрацаваць і стварыць касмічны карабель, які здольны высадзіцца на астэроід, што знаходзіцца больш чым у 3,6 мільярда кіламетраў ад Зямлі. «Трэціна зорак на небе носіць арабскія назвы, таму што арабы былі піянерамі ў астраноміі. Наша місія — узвялічванне арабскай цывілізацыі», — напісаў Аль Мактум у Twitter.

Актуальна

# СЯМ'Я — АПОРА ДЗЯРЖАВЫ

## Якія змены перажывае гэты інстытут і як захаваць адну з галоўных каштоўнасцяў?

**Усё часцей даводзіцца чуць развовы ў кантэксце таго, што дзяржава павінна зрабіць для сем'яў, для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі. А ці задумваўся хтосьці з нас, што кожная сям'я павінна зрабіць для краіны, для яе лепшай будучыні?! Пра гэта ў тым ліку гаварылі падчас круглага стала «Моцная сям'я — моцная дзяржава: адзінства ў краіне пачынаецца з яднання ў сем'ях», які напярэдадні Дня маці адбыўся ў прэс-цэнтры Дома прэсы.**




— Яднанне ў краіне пачынаецца з яднання ў сям'і, — заявіла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, член прэзідыума Беларускага саюза жанчын Лілія АНАНІЧ.** — Сям'я — гэта не простая ячэйка грамадства, а найважнейшы яго інстытут: у ёй закладваюцца маральныя каштоўнасці, захоўваецца пераемнасць пакаленняў, адбываецца выхаванне грамадзянскасці, пазнанне Радзімы — малой і вялікай. У сучасных умовах, калі ў поўным аб'ёме мы бачым нападкі на інстытут сям'і і назіраем прапаганду нетрадыцыйных каштоўнасцяў, вельмі важна нам, беларусам, умацоўваць сям'ю.

Як падкрэсліла парламентарый, дзяржава шмат сіл і сродкаў укладвае ў сям'ю. Толькі ў 2021 — 2025 гадах на яе падтрымку запланавана вылучыць каля 16 мільярдаў рублёў. «У нас самая развітая сістэма дапамогі сем'ям, — акцэнтавала ўвагу Лілія Ананіч. — Толькі дзіцячых дапамог існуе 11 відаў. Вялікі пакет падтрымкі рэалізуецца праз сістэму адукацыі, праз ахову здароўя — усё робіцца дзеля таго, каб умацоўваўся інстытут сям'і, а разам з тым і дэмаграфічная бяспека. І мы бачым плён. За апошнія гады колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася практычна ў два разы».

— Сёння ажыццяўляецца выклік тым каштоўнасцям, тым жыццёвым асновам, які існавалі на нашай зямлі на працягу стагоддзяў, — перакананы **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** — Наколькі мы правільна думаем, пакажа час. Аднак поўнасцю аддаваць усё на водкуп староннім сілам, прымаць рашэнні адносна мэтазгоднасці тых традыцый, якія ў нас існавалі на працягу стагоддзяў, напэўна, будзе глупствам пры любым раскладзе. Трансляцыя фарміравання духоўна-маральных каштоўнасцяў, якая сёння адбываецца на ўсіх сусветных платформах, ужо прымушае нас не проста напружвацца, а прымаць пэўныя меры па абароне. Калі верыць міжнародным даследаванням, базавыя каштоўнасці фактычна застаюцца непарушныя. І сям'я сярод іх — на першых пазіцыях.

Як паведаміла **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА,** падрыхтоўка моладзі да сямейнага жыцця — задача, якая не можа сыходзіць на задні план, яна заўсёды павінна быць у прыярытэце. «У сувязі з гэтым у школах развіваецца такая форма выхаваўчай работы як «Бацькоўскія ўніверсітэты», — адзначыла прадстаўнік Мінадукацыі. — Сёння перад педагогамі стаіць задача не толькі прыцягваць бацькоў да выхаваўчага працэсу, а і павышаць іх адукацыйны ўзровень: «узброіць» уменнямі і навыкамі найлепшых выхаваўчых практык, ведамі псіхалогіі развіцця дзіцяці, асаблівасцямі яго фарміравання і паводзін на кожным узроставым этапе».

Многія з прысутных пагадзіліся, што сёння казаць аб адукацыі ў адрыве ад выхавання немагчыма. Мала хто ведае, што ў нашай краіне апошнім часам з'явіліся замяшчальныя сям'і, якія з'яўляюцца альтэрнатывай інтэрнатным установам. «Сямейнае заканадаўства нашай краіны, дзяржаўная сямейная палітыка замацавала механізм перадачы дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у сем'і сваякоў, прафесіянальныя сем'і прыёмных бацькоў, — удакладніла Алена Сімакова. — У сучаснай Беларусі больш за 13 тысяч дзяцей выхоўваецца ў апякунскіх, прыёмных сем'ях, у дзіцячых дамах сямейнага тыпу. Штогод колькасць такіх дзяцей зніжаецца. У нас адпрацаваныя практычныя крокі па ўладкаванні кожнага асірацелага дзіцяці. Сёння ў нашай краіне няма такой формы ўладкавання, як школа-інтэрнат для дзяцей-сірот. У той жа час яшчэ ў пачатку стагоддзя такіх інтэрнатаў было 29».

Пасля круглага стала былі падведзены вынікі штогадовага рэспубліканскага конкурсу сярод сродкаў масавай інфармацыі «Моцная сям'я — моцная дзяржава». Сёлета на конкурс былі прадстаўлены 104 работы ад 86 рэдакцый. Як адзначылі члены журы, найвялікшую цікавасць выклікалі журналісцкія творы, якія ўбачылі свет у рэгіёнах.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

# ДОБРЫХ СПРАЎ — БЕЗЛІЧ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак далёка не кожнаму такая работа пад сілу. Гэта добра ведаюць ратавальнікі, якія часта становяцца сведкамі трагедый. А пачынаецца ўсё з таго, што людзі, у асноўным старыя і нямоглыя, бяруцца наводзіць парадак на сваіх падворках.

Каб папярэдзіць чарговыя няшчасныя выпадкі, а таксама яшчэ раз пагаварыць з пажылымі аб правілах бяспекі, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях разам з юнымі ратавальнікамі па ўсёй краіне наведваюць пенсіянераў, інвалідаў, а таксама ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія жывуць адны. У межах штогадовай акцыі «Моладзь за бяспеку» яны аказваюць пасільную дапамогу тым, хто ў гэтым мае патрэбу.



### ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ

Як праходзіць першы этап акцыі пад сімвалічнай назвай «112 добрых спраў», карэспандэнты «Звязды» ўбачылі на свае вочы. Наш працоўны дэсант «прызямліўся» ў аграгарадку Ждановічы, што пад Мінскам. Супрацоўнікі МНС, юныя ратавальнікі, а таксама прадстаўнікі Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства завіталі да Зінаіды Петрыман.

Пенсіянерка чакала гасцей (менавіта так яна называе ахвотных дапамагчы) на сваім падворку. Калі напярэдадні ёй патэлефанавалі з сельскага Савета і папярэдзілі аб нашым візіце, жанчына не здзівілася: апошнім часам супрацоўнікі МНС разам са школьнікамі дапамагаюць ёй рэгулярна. Летась, напрыклад, вымылі вокны. Цяпер гаспадыня задала ім іншы фронт работы. Папрасіла ўбраць капусту, ускапаць градкі, абрэзаць яблыню. «Калі не стоміцеся, то і лісце, калі ласка, зграбіце», — сціпла папрасіла пенсіянерка сваіх памочнікаў.

Зінаіда Антонаўна ў хаце адна. З мужам даўно разышліся. Дачка жыве ў Пасёлку, але слабы з яе памочнік — як і маці, яна інвалід. Сын з'ехаў у Расію, прыязджае рэдка. Дапамагае Зінаідзе Петрыман толькі сацыяльны работнік, якая прыходзіць двойчы на тыдзень. У асноўным, робіць хатнюю справу, ходзіць у краму па прадукты, выпісвае лекі... На іншае проста не хапае часу — падапечных у сацыяльнага работніка нямала.

Зінаідзе Петрыман цяжка прызвычаіцца да таго, што на многае ў яе проста не хапае сіл: здароўе моцна падводзіць. Аднак усё роўна імкнецца нешта пасадзіць: крыху бульбы, моркву, буракі, капусту, нават клубніцы ў яе растуць. «Пенсія невялікая, усяго не купіш, — тлумачыць сваю прагу да земляробства гаспадыня. — Праўда, з кожным днём усё складаней становіцца з гэтым спраўляцца».

Таму тое, што ўсяго за некалькі гадзін для яе зрабілі школьнікі і ратавальнікі, жанчына, вядома, не асіліла б. «Для мяне гэта вялізная дапамога, — прызнаецца пенсіянерка. — Няма нават слоў, каб у поўнай меры падзякаваць вам за працу».

### НЕАБХОДНЫЯ ПАДАРУНКІ

З пастаўленымі задачамі памочнікі справіліся досыць хутка. Зрабілі нават больш, чым прасіла бабуля: вырвалі цыбулю, якая дагэтуль знаходзілася ў зямлі, сабралі ўжо кранутага першым прымаразкам вінаград. Сапраўды, за работай час праляцеў непрыкметна. Вось што значыць рабіць нешта талакой!

Як адзначае **другі сакратар Мінскага раённага камітэта БРСМ Кацярына ПАХОМАВА,** на працягу года школьнікі наведваюць адзінокіх пажылых людзей, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і тых, хто мае патрэбу ў дапамозе. «Вясной у асноўным капаюць агароды, мыюць вокны, зімой чысцяць снег, восенню, як правіла, задзейнічаныя на добраўпарадкаванні прысядзібных участкаў, — удакладняе прадстаўніца грамадскага аб'яднання. — Дзеці з задавальненнем падключаюцца да добрых спраў, а яшчэ любяць сустракацца з ветэранамі, якія расказваюць цікавыя гісторыі, што адбыліся з імі ў гады вайны».



У канцы сустрэчы **інспектар сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Мінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях старшы лейтэнант Ілья ПАРШОНАК** падарыў Зінаідзе Петрыман вогнетушыцель, расказаў, у якіх выпадках і як ім карыстацца. Акрамя таго, ратавальнікі прагаварылі з пенсіянеркай усе магчымыя небяспечныя сітуацыі, а галоўнае, падказалі, як знайсці з іх выхад.

Абнавіўся ў гэты дзень у гаспадыні і пажарны апавяшчальнік — важны атрыбут бяспекі, які абавязкова павінен знаходзіцца ў доме кожнага, асабліва ў адзінокага чалавека, Зінаідзе Антонаўне падарылі прадстаўнікі Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства. Як мяркуе **старшыня Мінскага абласнога аддзялення арганізацыі Валерый СЯРГЕЙ,** тое, што сёння сумеснымі сіламі дапамаглі гэтай адзінокай хворай жанчыне, — высакародная справа. «Аб адным толькі можна шкадаваць: таких людзей у нашай краіне вельмі шмат, — перакананы ён. — Было б добра, каб наша моладзь, асабліва школьнікі, часцей дапамагалі пажылым людзям, якія засталіся адны. Для іх любая дапамога, нават прынесенае вядро вады, дарагога вартая».

### ДАПАМОГА З АКЦЭНТАМ НА БЯСПЕКУ

— Мы нясём адказнасць за людзей, якія самі сабе дапамагчы ўжо не могуць, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Аднак у першую чаргу акцыя «Моладзь за бяспеку» накіраваная на тое, каб, дапамагаючы грамадзянам, нагадаць ім пра асноўныя правілы бяспекі. Ідзе пачатак ацяпляльнага сезона, таму важна падказаць, як правільна паліць печ, што нельга дапускаць яе перагравання. Неабходна напомніць і тэлефоны службы ратавання: з узростам інфармацыя забываецца. Тым больш што раней, калі была патрэбная дапамога ратавальнікаў, набіралі нумар 01, а цяпер трэба 101 або 112. Прагаворваем з пажылымі людзямі ўсе небяспечныя сітуацыі: цяпер актуальна нагадаць пра тое, як не заблукаць у лесе. Зграбаючы лісце, яшчэ раз паўтараем, што спальваць яго небяспечна. На жаль, ахвярамі такіх пажараў у асноўным становяцца пажылыя: агонь выходзіць з-пад кантролю, а ў людзей ужо не тая рэакцыя, ды і не кожны можа самастойна справіцца са стыхіяй. Аб гэтым нагадваюць і юныя ратавальнікі. Добрыя справы застануцца ў памяці дзяцей, што дапамагалі людзям, якім з прычыны ўзросту многае зрабіць складана.

Падчас другога этапу акцыі — «Бабуліны рэцэпты бяспекі» — пенсіянерам прапануюць адчуць сябе зоркамі тэлеэкрана (іх будуць здымаць на відэа). Юныя ратавальнікі разам з пажылымі паспрабуюць не толькі прыгатаваць стравы беларускай кухні, а і пагавораць аб тым, якія ўмовы павінны быць створаныя, для таго каб усё прайшло бяспечна. Пенсіянеры не толькі змогуць падзяліцца сваімі рэцэптамі, а і чарговы раз згадаюць, у якіх умовах трэба ўтрымліваць жыллё, каб не адбылося бяды.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Анастасіі ШВАЙБОВІЧ.**

Слова дэпутата

# «Я мару пра дасканалы свет, свет, у якім жывуць толькі адказныя і добрыя людзі»

**Дэпутат, грамадскі дзеяч, доктар, маці, жонка, дачка — гэтыя іпастасі ўвасабляе ў сабе чарговая суразмоўніца «Звязды» Ірына ЛУКАНСКАЯ. Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў, днём яна працуе ў парламенце, а ўвечары спяшаецца на чарговае дзяжурства ў РНПЦ «Маці і дзіця» да сваіх маленькіх пацыентаў. Ірына Луканская імкнецца быць карыснай на ўсіх сваіх працоўных пасадах, бо дапамагаць людзям — галоўная справа яе жыцця.**



***— На гэтым тыдні адкрылася чарговая сесія ніжняй палаты парламента. Якія законапраекты ваша камісія прадставіць калегам?***

— Працуем над разнастайнымі, але самы вялікі — Грамадзянскі кодэкс, як казаў Прэзідэнт, «эканамічная Канстытуцыя краіны». Кожны дэпутат уносіць свае прапановы па зменах, збіраюцца рабочыя групы па тэме. Навацыі законапраекта прадугледжваюць замацаванне ў кодэксе такіх новых прававых інстытутаў, як беззадзыўная даверанасць, канвертаваная пазыка, апцыён на заключэнне дагавора, апцыйны дагавор. Законапраект рыхтуецца да першага чытання.

Асабіста вяду законапраект аб змяненні натарыяльнай дзейнасці. Ён таксама рыхтуецца толькі да першага чытання. Дадзены праект закона падрыхтаваны ў мэтах прывядзення натарыяльнай дзейнасці ў адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021 г. № 99-З «Аб ахове персанальных даных», а таксама з улікам практыкі прымянення закона аб натарыяце.

Як медработнік прымаю ўдзел у распрацоўцы законаў, накіраваных на ўдасканаленне медыцынскай дапамогі. Так, у нас быў у двух чытаннях прыняты закон аб ахове здароўя, да другога чытання рыхтуецца законапраект па пытаннях донарства крыві і яе кампанентаў. Шмат было дэбатаў наконт бязвыплатнага донарства. Але прадугледжаны разнастайныя шляхі кампенсаторных выплат, ільготы для бязвыплатных донараў. Магчымасць атрымаць выплату за здачу кампанентаў крыві застаецца.

Яшчэ як старшыня Гродзенскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын хацела бы звярнуць увагу на адзін законапраект, які звязаны з вельмі балючай тэмай — хатнім гвалтам. Новым законам пашырана кола пацярпелых, якіх адносяць да ахвяр хатняга гвалту, каб магчыма было дапамагаць большай колькасці людзей. Закон зараз дапрацоўваецца, улічваючы пажаданні грамадства.

***— Вы актыўны карыстальнік сацыяльных медыя. Ці звяртаюцца праз іх выбаршчыкі са сваімі пытаннямі?***

— Бывае, больш просяць праз месенджары прыйсці на прыём. Але дэпутатаў заўсёды суправаджаюць звароты людзей. У маёй практыцы большасць праблем датычыцца камунальных паслуг. Я думаю, як так зрабіць, каб камунальныя службы сталі больш эфектыўнымі, аператыўнымі. Задаюць пытанні па ахове здароўя, ковід вельмі напружвае сістэму. Тым не менш як спецыяліст адзначу: ахова здароўя ў Беларусі развіваецца. Калі сяджу на аператыўках у бальніцы, слухаю даклады калег аб іх штодзённай рабоце, здзіўляюся, бо іх маніпуляцыі часам — вышэйшы пілатаж. Вельмі хочацца, каб у кожным чалавеку выхоўвалася гэта павага да сваёй справы, да іншых і жаданне дапамагаць, а не толькі карыстацца.

***— У дэпутацтва вы прыйшлі з пасады кіраўніка Гродзенскай дзіцячай паліклінікі № 1. Вы вядомы педыятр у сваім горадзе. Як удаецца вам цяпер сумяшчаць урачэбную практыку з дэпутацтвам? Не сумуеце па сваёй мінулай рабоце?***

— Я працую дзяжурным педыятрам у РНПЦ «Маці і дзіця». Люблю сваю прафесію. Кажуць, што жаданне лячыць нельга вылечыць.

На папярэднім месцы працы ў Гродне ў мяне быў вельмі сяброўскі калектыў, збалансаваны па колькасці маладых спецыялістаў і вопытных урачоў. На галоўным месцы стаяў наш пацыент і яго сям'я. У супрацоўнікаў калектыву не было такога: закончылася працоўны час — і тых, хто чакае ў калідоры, не прымаю. Мы ўласным прыкладам паказвалі маладым: калі ў цябе шмат пацыентаў, ты не можаш зачыніць дзверы і пайсці дамоў.

***— Чаму вы вырашылі паспрабаваць сябе ў дэпутацкай рабоце?***

— Мы з маім калектывам Гродзенскай дзіцячай паліклінікі № 1 рабілі шмат добрых спраў, праектаў. І ў нейкі момант здалося, што можна зрабіць яшчэ больш. Спадзяюся, мае надзеі апраўдаюцца. Ды яны ўжо апраўдваюцца.

Работа ў Палаце прадстаўнікоў адкрыла новае бачанне шэрагу рэчаў. Улічваючы складаны 2020 год, можна сказаць, работа дапамагла зняць ружовыя акуляры на многае. Пачалася эпідэмія ковіду, краіна перажыла атаку, перадусім інфармацыйную. Мы недаацанілі значнасці ўсіх гэтых «укідаў» у нашу інфармацыйную прастору.

З калегамі з Гродзенскага гарадскога і абласнога Саветаў дэпутатаў я аднойчы выйшла на плошчу да тых, хто пратэстуе, каб з імі паразмаўляць. Яны кідалі ў наш бок ганебныя словы, хадзілі з бчб-сімволікай. У мяне было адчуванне, што я вярнулася ў ваенныя 40-я. Ведаю шмат людзей, якія, трапіўшы адзін раз на пратэст, убачыўшы агрэсіўнасць некаторых, зразумелі: ім не гуляць у адной камандзе.

Зараз мы жывём з санкцыямі, але я лічу, што яны зробяць нашу краіну мацнейшай, калі мы захаваем адзінства ў дзяржаве і кожнай сям'і.

***— Не магу ў вас не запытацца пра ваша стаўленне да вакцынацыі. Гэта ж вельмі значная і актуальная тэма для кожнага.***

— Я і ўся мая сям'я вакцынаваліся. Заклікаю да гэтага ўсіх. Так, зрабіўшы прышчэпку, ты можаш захварэць. Эфектыўнасць нават «Спадарожніка V» каля 93 працэнтаў, то-бок сем чалавек са 100 захварэюць. Але яны перанясуць хваробу лягчэй. Калегі кажуць, што ў ковід-рэанімацыі прышчэпленых няма.

Не трэба хвалявацца, калі пасля прышчэпкі павысілася тэмпература — значыць, больш выпрацоўваецца антыцел. Мы закупляем вакцыну «Спадарожнік V» у краіны, якая ёю прышчапляе сваіх грамадзян, — яшчэ адно пацвярджэнне, што яна якасная.

Задача сёння — зрабіць каранавірус сезонным вірусам, кіруемым. Вось вакцына ад грыпу, памятаю са студэнцтва, — гэта была «жывая» вакцына, ад яе хварэлі, пераносілі лёгкі грып. Зараз усе вакцыны інактываваныя — не могуць выклікаць захворванне. Вакцына «Спадарожнік V» — вектарная вакцына на адэнавірусе, таму ад яе могуць быць грыпападобныя сімптомы, якія праходзяць без наступстваў.

Зараз вакцынацыю першым кампанентам прайшло больш за 2 мільёны беларусаў, але каб была эфектыўнасць, неабходна прышчапіцца не менш чым 60 працэнтам насельніцтва.

***— Ці кансультуеце і заахвочваеце сваіх калег-дэпутатаў да вакцынацыі?***

— Канешне. Многія калегі, у каго няма супрацьпаказанняў, вакцынаваліся. Некаторыя прыходзяць, пытаюцца, ці варта прышчапляцца. Калі чалавек хварэў, кажу: неабходна пачакаць ад 3 да 6 месяцаў. Але некаторыя калегі, асабліва мужчыны, крыху асцерагаюцца і не робяць прышчэпкі.

***— Ці застаецца ў вас час на захапленні, сям'ю?***

— У мяне двое дарослых дзяцей — сын і дачка. Я замуж выйшла рана, у нас з мужам каханне са школьных часоў. Ужо чацвёра ўнукаў. Жартам называю сябе не бабуляй, а шматдзетнай жонкай дзядулі. У мяне вельмі актыўная маці, з якой бяру прыклад. Яна, нягледзячы на ўзрост, заўсёды нешта робіць, імкнецца мне дапамагчы.

У вольны час хочацца атрымаць асалоду ад зносін з сям'ёй: разам мы нешта гатуем; бывае, проста гуляем па лесе. Вельмі важна адчуваць сябе ў моманце і разумець, наколькі выдатна, што ты ёсць на гэтым свеце і можаш змяніць яго да лепшага. Вельмі люблю дапамагаць людзям — вось гэта маё захапленне для душы.

***— Што робіць вас шчаслівай?***

— Я вельмі спачуваю маці, у якіх хворыя дзеці, бо сама разумею: калі хварэе дзіця, нічога не хочацца, акрамя яго выздараўлення. Гэта вялікае шчасце — здаровыя дзеці. Калі дома ўсе здаровыя, можна працаваць, тварыць, вынаходзіць, крылы вырастаюць для вялікіх спраў. Вельмі важна бачыць прыгажосць навокал і вучыць гэтаму дзяцей, каб яны былі таксама шчаслівыя. Дапамагаць блізкаму — таксама шчасце. Неабходна, каб моцны падтрымліваў слабага: бацькі — дзяцей, дарослыя дзеці — сталых бацькоў. Такое кола ўзаемадапамогі павінна быць у кожным доме і ва ўсёй нашай дзяржаве. Мая мара, каб у нашай краіне не было інтэрнатных устаноў ні для старых, ні для дзяцей. Я мару пра дасканалы свет, свет, у якім жывуць толькі адказныя і добрыя людзі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

Энергетыка

# ЯДЗЕРНАЯ БЯСПЕКА І ПЛАНАВАЯ РЭВІЗІЯ

## Што будзе адбывацца на БелАЭС да канца года

**Пост-місія МАГАТЭ прыедзе на БелАЭС у снежні, а на днях уступіць у сілу ўказ аб рэгуляванні дзейнасці ў галіне выкарыстання атамнай энергіі і крыніц іанізуючага выпраменьвання. Пра гэтыя і іншыя моманты, якія датычацца ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў краіне, расказалі эксперты галіны.**

### «Гарачая» абкатка і комплексная ацэнка

Адключаны ад сеткі аўтаматычнай абаронай генератара 12 ліпеня першы рэактар БелАЭС пасля рамонту быў ізноў падключаны да энергасеткі краіны ўвечары 4 кастрычніка. А на другім энергаблоку паспяхова скончылася «гарачая» абкатка рэактарнай устаноўкі. Падчас абкаткі спецыялісты правялі каля 300 выпрабаванняў, асноўная мэта якіх — пацвярджэнне адпаведнасці сістэм і абсталявання «ядзернага вострава» праектным характарыстыкам. У тым ліку праверка бяспекі работы энергаблока на намінальных параметрах, а таксама пры разагрэве і ахаладжванні рэактарнай устаноўкі.

На рабочых параметрах (пры ціску ў першым контуры 160 кг/см$^2$ і тэмпературы +2800 °С) правяралася працаздольнасць усіх чатырох галоўных цыркуляцыйных помпаў і сістэм кіравання і абароны рэактарнай устаноўкі і электрасілкавання ўласных патрэб. Зроблена таксама прадзіманне ўласным парам галоўных параправодаў і выпрабаванні галоўных засцерагальных клапанаў парагенератараў, іншыя аперацыі.

— Выпрабаванні пацвердзілі, што ўсё абсталяванне і тэхналагічныя сістэмы энергаблока, якія задзейнічаны ў праграме «гарачай» абкаткі, адпавядаюць праектным характарыстыкам. Адпаведна з планам падрыхтоўкі энергаблока да фізічнага пуску, наступным этапам стане рэвізія асноўнага і дапаможнага абсталявання першага і другога контураў энергаблока, — расказаў **Віталь ПАЛЯНІН, дырэктар праекта па стварэнні Беларускай АЭС АТ «Атамбудэкспарт».**

А ўжо 5—13 снежня ў Беларусі будзе працаваць пост-місія МАГАТЭ па комплекснай ацэнцы рэгулюючай інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. Місія прайшла ў 2016 годзе, а пост-місія скіравана на тое, каб разгледзець, як Беларусь выконвае рэкамендацыі і нацыянальны план дзеянняў, сфарміраваны па выніках 2016-га, паведаміла **Наталля ДАНІЛЕНКА, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Дзяржатамнагляда**:

— У нацыянальны план уключана больш за 70 мерапрыемстваў, якія ахопліваюць усе напрамкі рэгулюючай дзейнасці, ад удасканалення наглядной дзейнасці і нарматыўна-прававой базы да ўзаемадзеяння з грамадскасцю.

### Павышэнне і рэгуляванне бяспекі

Своечасовае інфармаванне насельніцтва пра стан радыяцыйнай бяспекі і паведамленне аб тым, што робіцца дзеля падтрымання яе на належным узроўні, — пачынанне, якое знайшло адлюстраванне ў штогадовых аглядах стану ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў Беларусі. Гэтыя дакументы арыентаваныя на шырокую аўдыторыю і змешчаны ў адкрытым доступе.

— Інфармаванне — неад'емная частка рэгулюючай дзейнасці Дзяржатамнагляда. Зводная інфармацыя пра стан ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў Беларусі ў выглядзе аглядаў рыхтуецца з 2014 года і сёлета з'явіўся чарговы агляд за 2020-ы, — адзначыў **Дзмітрый ПАЎЛАЎ, начальнік аддзела навукі і інфармацыі Дзяржатамнагляда.** — У дакуменце пазначаны асноўныя леташнія мерапрыемствы і з'явы ў галіне рэгулявання ядзернай бяспекі. Яны датычацца павышэння ўзроўню бяспекі пры выкарыстанні крыніц іанізуючага выпраменьвання, ядзерных установак, забеспячэння ядзернай бяспекі ў рэгіёнах, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, функцыянавання сістэмы радыяцыйнага кантролю.

Значная частка матэрыялаў сёлетняга агляду, які ўбачыў свет у жніўні 2021-га, прысвечана забеспячэнню бяспекі АЭС. У прыватнасці, тут з тэхнічнага пункту гледжання паказаны шэраг значных мерапрыемстваў, звязаных з запускам станцыі летась.

У 2019 годзе быў прыняты закон аб радыяцыйнай бяспецы, які ўступіў у сілу ў чэрвені 2020-га. На працягу бягучага года быў прыняты шэраг нарматыўных дакументаў, якія вызначалі новыя патрабаванні ў дадзеной галіне. Падрыхтавана 46 праектаў нарматыўных прававых актаў, з якіх 21 — гэта тэхнічны нарматыўна-прававы акт (нормы і правілы па забеспячэнні ядзернай і радыяцыйнай бяспекі), дзве пастановы Саўміна, 15 — МНС і восем дапаможнікаў па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы (тлумачальныя дакументы, якія ўтрымліваюць механізмы і магчымасці рэалізацыі нормаў і патрабаванняў па ядзернай бяспецы).

І хоць Беларусь, як удакладніў спецыяліст, застаецца ў статусе краіны-навічка ў ядзернай галіне, наспела неабходнасць развіцця ядзернага права. Летась быў падрыхтаваны праект указа аб рэгуляванні дзейнасці ў галіне выкарыстання атамнай энергіі і крыніц іанізуючага выпраменьвання. Гэты дакумент рэгламентуе пытанні дзяржрэгулявання ў сферы ліцэнзавання ў гэтай галіне, а таксама ўстанаўлівае патрабаванні да суіскальніка ліцэнзіі і іншыя пытанні ліцэнзавання. Указ уступае ў сілу на гэтым тыдні, у выніку чаго зменіцца фармат нашых далейшых аглядаў. Акцэнт у іх будзе рабіцца на прынятымі рэальных мер і мерапрыемстваў, якія праводзіць АЭС для забеспячэння ядзернай і радыяцыйнай бяспекі.

**Ірына СІДАРОК.**

## Результаты проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Юбилейный урожай призов»

Мы сталі размаўляць з ім і адразу пераканаліся, што хлопчык прыкмячае асеннее хараство, сам з радасцю расказвае пра багацце фарбаў, палёт павуцінак, пра позвія кветкі... А мне да таго ж успомнілася гісторыя, якую чула ў дзяцінстве.

Бабуля распавядала, што роды раней прымалі бабкі-павітухі. Іх, дасведчаных і спрактыкаваных, тады ў акрузе нямала было, але ж да парадзіхі запрашаліся адмысловыя — калі можна так сказаць, «абраныя небам», прычым не абы калі, а менавіта ў бабіна лета.

Якраз тады, у два першыя тыдні кастрычніка, у нас, на самым усходзе Магілёўшчыны, усе бабкі-павітухі цягнулі жэрабя і паводле яго вызначалі, што панядзелак, напрыклад, гэта дзень Аўдоцці, аўторак — Дар'і, серада — Пелагеі...

На працягу гэтых жа чатырнаццаці дзён да Пакроваў і сама парадзіха, і яе блізкія ўважліва адсочвалі надвор'е. Калі Дар'ін дзень выдаваўся ветраным, лічылася, што і роды, якія Дар'і належыць прымаць, могуць аказацца цяжкімі, а дзеткі — плаксівымі ды неспакойнымі... І наадварот: цёплы, сонечны дзень Пелагеі азначаў, што прынятыя ёй немаўляты з'явяцца на свет без ніякіх складанасцяў, будуць спакойнымі і здаровымі. Калі ж на нечы дзень выпадалі дажджы, наплакацца маглі і матулі, і дзеці...

Такім чынам, бабіна лета выбірала, вызначала самых запатрабаваных павітух года. Яно ж было часам асаблівых чаканняў і надзей, часам шчырых малітваў да Божай Маці.

...Я пераказала хлопчыку тое, што чула ад сваёй бабулі, і потым даведалася, што са школы ён прынёс «дзясятку», што, вядома ж, прыемна... Хоць і да болю крыўдна, што дзеці дрэнна ведаюць родную мову. Нехта схільны вінаваціць у тым бацькоў ды настаўнікаў. Мне ж здаецца, што віна тут усіх дарослых, якія пакуль не ўсвядомілі сябе сапраўднымі беларусамі.

**Наталля Сівак,**
*Чэрвеньскі раён.*

Што бачу

## ...І ТАДЫ ЎСЕ ЖАНЧЫНЫ СТАНУЦЬ ПРЫНЦЭСАМІ

**Надоечы званю сваяку, віншую з днём нараджэння, хвілін праз колькі пытаюся, што ў яго новага? «Дык жа падарунак! — хваліцца Міша. — Дзеці скінуліся і купілі мне робат-пыласос! Такая штуковіна!.. Учора дзве гадзіны за ім сачылі — і смяяліся, і любаваліся...»**

Настрой сваяка зразумець няцяжка, да таго ж калі ведаць, што жонка ў яго даўно хварэе, што ўсю так званую жаночую работу ён робіць сам, хоць, мякка кажучы, і не любіць. Казаў, што машыну дроў яму пакалоць лягчэй, чым вазіцца з нейкім баршчом ці катлетамі!

Я гэта ведала і разумела, а вось такой штуковіны, як робат-пыласос, не бачыла ні разу. Так што папрасіла Мішу расказаць, у чым яго перавагі. «Дык слухай, — з ахвотай згадзіўся сваяк. — Спачатку той робат абследуе контуры пакояў дома. Потым ты задаеш яму праграму, і ён пачынае працаваць. Можна заказаць вільготную прыборку, можна — чыстку ў адным нейкім куце... Ён зробіць... І так цікава за ім назіраць! Як аб'язджае ножкі крэслаў, як мые пад ложкам і вакол яго, як чысціць дываны, як сам і ў належным месцы выгружае смецце, нават размаўляе, як чалавек! Можа сказаць: «Мала вады». Значыць, трэба вядро паставіць, каб загрузіўся... А калі ўсё добра, можна і аднаго пакінуць: назіраць за работай па камп'ютары. А можна даць каманду, каб прыбраў толькі адзін пакой, а самому ў гэты час паехаць у краму. Карацей, на цэлы вечар пацехі было!» — падсумаваў сваяк і на гэтым не спыніўся. Сказаў: «Ведаеш, так добра, калі ў хаце ёсць з кім пагаварыць! Вось і той жа мультыварцы задаеш задачу, яна ўсё зробіць і адрапартуе. Наколькі чалавеку лягчэй, — нават не ўяўляеш!»

...Калі не ведаеш, то і сапраўды. Помню, гадоў 20 таму цётка расказвала, як купіла пральную машыну-аўтамат. Амаль даслоўна: «Ды такую ж разумніцу! Такую малайчынку! Яна ж і памые ўсё, і прапалошча, і адцісне!.. Я кожны разок ёй кнопачкі пагладжу-падзякую — працаўніцы маёй!»

А ў брата гадоў сем таму з'явілася машына для мыцця посуду. Казаў, іх старую цукерніцу з узорыстым малюнкам адмыла так, што ледзьве пазналі, хоць перад гэтым збіраліся выкінуць... І астатні посуд — каструлі, патэльні, шклянкі — усё цяпер блішчыць ды ззяе чысцінёй!

Што на гэта сказаць? Што жыццё не стаіць на месцы? Што гадоў праз колькі мы перастанем здзіўляцца і робату-пыласосу, і робату-афіцыянту, што пры жаданні на хаду, на вуліцах, у спецыяльных кабінках зможам прыняць душ, зрабіць прычоску, за лічаныя хвіліны памыць адзенне?

Прагрэс, адным словам!

І радасна ад яго, і трошкі страшна: не дай бог нашы хлопцы ды мужчыны жаніцца перастануць?

Ці наадварот — не трэба аб гэтым непакоіцца? Маючы такіх вось робатаў-памочнікаў, любая жонка зможа і жыць, і выглядаць прынцэсай!

**Валянціна Бобрык,**
*г. Івацэвічы.*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С.В., извещает о проведении 26 октября 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 90 % по продаже ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **ДЕБИТОРСКАЯ ЗАДОЛЖЕННОСТЬ:** ТУП «Гомельская универсальная база» (УНП 400058629) | **217,09** | 10,85 | 21,71 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 733-03-49 – управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 октября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 22 октября 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Гомельская правда» от 15.07.2021 г.**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## ГРОДНЕНСКОЕ ОБЛАСТНОЕ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОЕ ОБЩЕСТВО (ДЯТЛОВСКИЙ ФИЛИАЛ) извещает о проведении электронных торгов

### Аукцион № 6071
### ЛОТ № 33973 – КОМПЛЕКС КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ БЫВШЕЙ ОПТОВОЙ БАЗЫ в г. п. Новоельня, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская

- Капитальное строение с принадлежностями (склады I очереди с рампами), инвентарный номер 451/С-11374, площадью 7576,5 кв. м, целевое назначение – административно-бытовые здания, наименование – административно-бытовые здания, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;
- капитальное строение, инвентарный номер 451 /С-15228, площадью 615,0 кв. м, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – металлический склад № 5, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;
- капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15201, площадью 6,0 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – туалет, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;
- капитальное строение, инвентарный номер 451 /С-15461, площадью 0,0 кв. м, целевое назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории, состоящее из ограждения железобетонного 105,59 м, ворот 5,8 м, ворот 6,0 м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/2;
- капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15458, площадью 0,0 кв. м, целевое назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – подъездной железнодорожный путь, протяженность – 451,2 м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/2;
- капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15202, площадью 12,0 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – контрольно-пропускной пункт, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15.

Лот располагается на следующих земельных участках:

- кадастровый номер 422383190602000812, площадью 0,0036 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания контрольно-пропускного пункта, право постоянного пользования. Адрес: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/1. Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав в использовании земель;
- кадастровый номер 422383190602000813, площадью 4,5731 га, целевое назначение – Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений, право постоянного пользования. Адрес: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений): земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадь – 0,0170 га;
- кадастровый номер 422383190602000830, площадью 0,0192 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания подъездного пути со стрелочным переводом № 31, право аренды, доля в праве – 1/2. Адрес: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, в районе ул. Новогрудской. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений): земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3.5, площадь – 0,0192 га.

Комплекс капитальных строений находится на окраине г. п. Новоельня Дятловского района Гродненской области. Канализационная и водопроводная сети нуждаются в капитальном ремонте. Отопление отсутствует.

Проезд на территорию возможен как железнодорожным, так и автомобильным транспортом.

**Начальная цена продажи – 602 948,82 руб.** (шестьсот две тысячи девятьсот сорок восемь белорусских рублей 82 коп.), в т. ч. НДС

**Начало электронных торгов: 22.11.2021 09.00**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по адресу лота: **https://torgi.gov.by/lot/33973/6071/kompleks-kapital-nyh-stroenij-byvshej-optovoj-bazy** необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток

**Продавец** – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел.: 8 (01563) 64581, 68264**

**Организатор аукционов** – Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел.: 8 (017) 200 73 33, 8 (029) 675 98 28**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 календарных дней с момента определения победителя торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента определения победителя торгов

Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя.

Победитель торгов возмещает стоимость затрат на проведение аукциона согласно прейскуранту (**https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**) от фактической цены продажи лота, которая списывается с суммы внесенного Победителем аукциона задатка. Оставшаяся сумма задатка засчитывается в счет оплаты предмета аукциона.

Победитель также возмещает Продавцу расходы по публикации объявлений о проведении аукциона в газете «Звязда» и дятловской районной газете «Перамога».

Возмещение затрат по организации и проведению аукциона победитель осуществляет не позднее 5 рабочих дней с момента завершения торгов

**Расчетный счет для перечисления задатка: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109, ОКПО: 37533622, Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

## Околовский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области извещает о проведении 19 ноября 2021 года открытого аукциона по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и не завершенного незаконсервированного капитального строения:

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и не завершенного незаконсервированного капитального строения** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, д. Околово, д. 19А, земельный участок с кадастровым номером 623285409101000057, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и не завершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством не законсервированный жилой дом) | 0,2500 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, имеется подъездная асфальтовая дорога | 8 597,18 | *Публикация в газете + 477,00 руб.* | 859,72 |

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» и Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.20014 г. № 298 (питьевое водоснабжение 1558,58 руб./(1 куб.м/сут.); электроснабжение 1628,45 руб./1 кВт).

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет (IBAN) BY53AKBB36006191211090000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка (BIC) AKBBBY2X, код платежа – 04901, получатель – Околовский сельский исполнительный комитет, УНП 600181669, ОКПО 04431582.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов.
2. Представить квитанцию об оплате суммы задатка.
3. Предъявить документ, удостоверяющий личность, либо доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом или по его поручению с государственной организацией по проведению аукционов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 19 ноября 2021 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Околово, д. 52.**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Последний день приема заявлений – **16 ноября 2021 года до 17.00.**

Контактные телефоны: **8 (01774) 51-7-35, 72-1-58.**

белагропромбанк традиции будущего

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.10.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 251 506 | 253 018 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 275 | 268 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 964 896 | 900 988 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 396 244 | 246 010 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 194 375 | 3 094 253 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 8 098 420 | 7 657 992 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | 128 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 147 029 | 142 472 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 276 794 | 283 129 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 218 | 225 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 6 944 | 7 047 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 34 438 | 55 574 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 13 371 139 | 12 641 104 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 379 339 | 308 300 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 2 273 754 | 2 058 285 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 7 997 687 | 7 730 678 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 825 158 | 666 568 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 431 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 110 | 110 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 42 027 | 56 193 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 11 518 075 | 10 820 565 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 1 238 352 | 1 238 352 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 74 369 | 45 579 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 113 425 | 126 089 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 426 918 | 410 519 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 853 064 | 1 820 539 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 13 371 139 | 12 641 104 |

### ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь – сентябрь 2021 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.10.2021 | 01.10.2020 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 646 574 | 555 115 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 450 540 | 303 550 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 196 034 | 251 565 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 226 217 | 190 031 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 76 487 | 69 721 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 149 730 | 120 310 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 130 | 31 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 3 609 | 7 064 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 32 211 | 55 720 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (729) | 254 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 100 622 | 132 579 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 72 585 | 14 560 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 271 806 | 244 691 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 20 594 | 22 416 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 60 548 | 49 818 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | - | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 60 548 | 49 818 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

Председатель Правления А.А.Лысюк

Главный бухгалтер М.А.Шаповалова

Дата подписания: 4 октября 2021 г.

Финансовая отчетность опубликована на сайте: **https://www.belapb.by/about/pokazateli-deyatelnosti-i-finansovaya-otchetnost/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-standartam/ezhekvartalnaya-otchetnost/na-otchetnuyu-datu-01-10/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# «З пабітаю лютняй ідзе паэт...»

*«Імжа, імжа засцілае свет,*
*Размыты дажджамі шлях.*
*З пабітаю лютняй ідзе паэт*
*Сірано дэ Бержэрак.*
*Жыццё неўзаметку, як дым, прайшло...*
*Пакінута недзе труна...*
*Ніхто не частуе яго даўно*
*Бадзёрай бутэлькай віна...*
*Гадоў кавалькады ніхто назад*
*Не можа адкінуць бег.*
*І месяц смяецца, як тлусты абат,*
*Над торбай паэтавых бед...»*



**Верш, які гучыць як дасканалы пераклад нейкага класіка сусветнай літаратуры, быў напісаны на Беларусі ў 1929—1930-х гадах.**

**Ягоны аўтар, валодаючы некалькімі мовамі сапраўды шмат займаўся перакладамі, і дасканала ведаў сусветную паэзію.**

**А свой талент уклаў у беларускую культуру, хоць нарадзіўся, між іншым, у Астрагожску Варонежскай губерні, у сям'і аптэкара, 110 гадоў таму. І каб у 1921 г. не пераехаў з бацькамі ў Мсціслаў, не мелі б мы ў сваёй гісторыі выдатнага паэта, якога ўспамінаюць незаслужана мала.**

## «Мой палісад засыпаў пухкі снег...»

Пачнём з чарговага звароту да фонду крытыка Лукі Бэндэ, які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Як вядома, «аглабельны крытык» Лука Бэндэ збіраў рукапісы рэпрэсіраваных пісьменнікаў. Ёсць там і рукапіс, на якім напісана: «Ю. А. Таўбін. Лірыка. Эпас. Выбраныя вершы 1928 — 32 г.». На ім штамп ад 23 лістапада 1932 года «Падпісана ў друк». Захаваўся бланк за № А1232 да рукапісу, адрасаваны друкарні. Там значыцца, што Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі накіроўвае да друку зборнік «Лірыка-эпас» аўтара Юлія Таўбіна аб'ёмам 128 старонак, накладам 2000 асобнікаў.

Яшчэ адзін рукапіс Таўбіна ў архіве Бэндэ — зборнік перакладаў Генрыха Гейнэ.

Абодва рукапісы так і не сталіся кнігамі.

На фотаздымку, які выяўляе юнага Юлія (Юдэля) Таўбіна, — задумлівы малады чалавек з пышным чубам, пульхнымі вуснамі і мройным позіркам цёмных вачэй... Як пісаў Сяргей Грахоўскі, *«Сярод пісьменнікаў Таўбін быў адметны ад усіх: зрэнкі аксамітна-чорных вачэй, здавалася, бачаць навылёт, выразныя тоўстыя губы нечым нагадвалі Пушкіна, у свае дзевятнаццаць гадоў ён хадзіў трошкі сагнуты, нібы толькі ўстаў з-за стала».*

У Мсціслаўлі, дзе Таўбін вучыўся ў школе, потым у педтэхнікуме, ён знайшоў сапраўдных аднадумцаў, якія стварылі літаратурную групу «Мсціслаўцы». Туды ўваходзілі разам з ім Аркадзь Куляшоў і Змітрок Астапенка.

Сяргей Грахоўскі так успамінаў пра пачатак іх творчага шляху:

*«Мы пасябравалі, не ведаючы адзін аднаго. У Мсціславе жыў Юлі Таўбін, у Мінску — Алесь Розна, у Глуску — я. Часопіс «Беларускі піянер» часта друкаваў нашы вершы з тытулам «піянер» перад прозвішчам. Рэдагаваў часопіс Алесь Якімовіч і кожнаму паведаміў адрас сваіх найбольш сталых карэспандэнтаў. Адразу паляцелі пісьмы ў Мсціслаў, у Мінск і ў Глуск.*

*Пра што мы толькі не марылі тады, пра што не пісалі адзін аднаму. У кожным лісце былі вершы. Многія з іх друкаваліся, а некаторыя ўвайшлі ў пасмяротныя выданні Юлія Таўбіна. Вось ужо сорак чатыры гады памяць беражэ яго радкі, напісаныя ў пару дзяцінства.*

*Мой палісад засыпаў пухкі снег,*
*Даўно-даўно асыпалісь жасміны,*
*Раяцца часта ў думках у мяне*
*Урыўкі ўжо забытых успамінаў».*

## «Гавораць, што жыць лірыкам, магчыма, цяжэй за іншых...»

Таўбін робіцца чальцом літаратурнага аб'яднання «Маладняк», а ў 1927-м яго выключаюць разам са Змітраком Астапенкам, Петрусём Броўкам і Кастусём Губарэвічам. У кожнай творчай арганізацыі свае «непажаданыя».

Калі ў 1929-м Мсціслаўскі педтэхнікум зачыняюць, Таўбін у ліку тройкі «мсціслаўцаў» адпраўляецца ў Мінск, паступае на літаратурны факультэт падінстытута і нават уступае ў БелАПП — Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў. Дзіўны выбар — бо пралетарскія паэты змагаліся з «буржуазным фармалізмам», варта было паэту прыдумаць незвычайны вобраз — аглабельная крытыка напагатоў... А ў Таўбіна паэзія цалкам упісваецца ў еўрапейскі кантэкст з усімі яе сімвалізмамі:

*«Кожны з маленства злучаны выракам,*
*А потым крывёю аплочае чыншы.*
*На Беларусі зрабіцца лірыкам*
*Куды лягчэй, як чым-небудзь іншым.*
*Вагон прарываецца рыбай праз нерат,*
*Бярозы галлём быцццам б'юцца аб шыбы.*
*І так мая лірыка рвецца наперад,*
*Як гэтая самая ў нераце рыба.*
*...З маленства з нас кожны*
*злучаны выракам*
*Плоціць за вырак багатыя чыншы...*
*Гавораць, што жыць лірыкам,*
*Магчыма, цяжэй за іншых...»*

БелАПП варагаваў з «Маладняком», так што пераход туды Таўбіна выглядае стратэгічным крокам. Грахоўскі ўспамінае пра Таўбіна тых часоў:

*«Ён тады разам з Астапенкам і Куляшовым жыў у прыватным пакойчыку на вуліцы Розы Люксембург. Тры мсціслаўцы былі амаль неразлучныя. У тыя гады вуліца Люксембург была своеасаблівым беларускім Парнасам: там кватаравалі Пятро Глебка, Таўбін, Астапенка, Куляшоў, Сяргей Дарожны, Віктар Казлоўскі, Лужанін і цэлая чарада маладзейшых паэтаў наймала пакойчыкі і катушкі ў мінскіх чыгуначнікаў і рамеснікаў за пераездам».*

Зразумела, вершы Таўбіна не маглі быць па-за ўвагай аглабельных крытыкаў кшталту Кучара і Бэндэ. Юлія абвінавачвалі найбольш у «псыхокапанні». А крытык Кабакоў напісаў у рэцэнзіі на першы зборнік Таўбіна «Агні», што той, па-першае, даў эпіграфам да сваёй кніжкі *«вытрымку з заядлага беларускага контррэвалюцыянера паэта Ул. Дубоўкі... Па-другое, ва ўсёй кніжцы мы не знайшлі ніводнага слова, дзе гаварылася б аб партыі, аб рабочым класе, які будуе сацыялізм...»*

Якімі б трывожнымі ні рабіліся абставіны жыцця, паэты былі маладыя, натхнёныя і, як і іх калегі ва ўсе часы, марылі пра вечнае і шукалі багемнага асяродка. Напрыклад, Таўбін, сціплы інтэлектуальны юнак, увайшоў у ТАВІЗ — Таварыства аматараў выпіць і закусіць. Гэта, вядома, суполка жартоўная, сяброўская — не толькі выпівалі-закусвалі, але чыталі вершы, горача дыскутавалі... Зноў звернемся да ўспамінаў Грахоўскага: *«Мы пайшлі да Мікуліча. Мінулі драўляны мост праз Свіслач. Увесь раён за ракою быў драўляны. Толькі што адбушавала паводка, і прырэчныя домікі стаялі без вокан і платоў. Па дарозе Таўбін купіў ладны пакунак цукерак «Мішка». Мы імі ласаваліся па дарозе і пакуль ён чытаў паэму. У Барысаў пакойчык пад самым дахам вяла цёмная лесвіца. Канапка, стол і паліца з кнігамі — вось і ўся мэбля.*

*Юлі, падкурчыўшы ногі, сеў на канапку і, пагойдваючыся ў такт рытму, пачаў чытаць:*

*На шалік зор,*
*Змяніўшы хмар башлык,*
*Нясуць дазор*
*Вясна і маладзік.*

*Паэма мяне ўсхвалявала экзотыкай нябачных крымскіх пейзажаў, дасведчанасцю аўтара, звонкім рытмам, дакладнасцю радка і страфы. Таўбін быў, бадай, самы начытаны і эрудзіраваны сярод тагачасных маладых паэтаў. І ён, як і Розна, вывучаў нямецкую і англійскую мовы, зарубежных паэтаў чытаў у арыгінале і перакладаў без падрадкоўнікаў. Пры ім я станавіўся скаваны, саромеючыся свайго вясковага, правінцыяльнага прымітывізму».*

## «І от — Цюмень. Замоўк зацяты у той сібірскае цішы»

Таўбіна арыштавалі ў канцы лютага 1933-га. Як сведчыла дачка Аркадзя Куляшова Валянціна, «повадам для першага арышту Юлія Таўбіна стаў ліст з-за мяжы ад цёткі, якая нібыта пераехала з Польшчы ў Амерыку». Даследчык творчасці Таўбіна Віктар Жыбуль заўважае: *«На пачатку 1933 г. Юлі Таўбін яшчэ здолеў падаць голас са старонкі «ЛіМ'а», распавёўшы пра свае творчыя планы:* «У 1933 годзе хачу дапісаць даўно пачатую вершаваную аповесць «Доктар Батурын». Хачу напісаць некалькі вершаў, што даўно ў мяне наспяваюць. Выйдзе кніга «Лірыка. Эпас». Буду перакладаць ангельскіх і нямецкіх паэтаў»




Аповесць засталася недапісаная, кніга не выйшла... Таўбіна саслалі ў Цюмень, дзе ён працаваў у тэатры загадчыкам літаратурнай часткі. Паэт Змітрок Віталін, аднакурснік Юлія, прысвяціў яму верш, які пачынаецца радком «Яго саслалі да Цюмені...»:

*«І от — Цюмень. Замоўк зацяты*
*У той сібірскае цішы.*
*І хоць няма на вокнах кратаў —*
*Палеглі краты на душы...*
*Не чуючы жывога слова*
*Радзімы-матухны сваёй,*
*Пачаў пісаць на рускай мове —*
*Дзівосных думак сумны строй».*

Так, Таўбін шмат перакладае і спрабуе ствараць на рускай мове, шле ў друк... Цудам захаваліся рукапісы яго паэм «Міхайла» пра Ламаносава і «Осада» пра падзеі Грамадзянскай вайны. Але ссыльнаму надрукавацца было немагчыма. Як пісаў у тым жа вершы Змітрок Віталін,

*«Прынёс у друк...*
*Спыталі: хто вы?*
*Ён адказаў, як мае быць.*
*— Ваш верш па думцы свежы, новы,*
*Ды вершы трэба вам забыць...*

*Смяюся з выдумкі жартоўнай*
*(А ці жартоўнай, як сказаць?)*
*Што вывучаў англійскую мову,*
*Каб цягу ў Альбіён задаць...*
*Сябры яго любілі:*
*— Юлька!*
*І ён умеў сяброў любіць.*
*А той, у Крамлі, пасмоктваў люльку*
*І думаў, як яго забіць».*

Пачалася хваля паўторных арыштаў. 4 лістапада 1936 года Таўбіна арыштавалі зноў. Ён крыкнуў адному са знаёмых у мінскай турме: «Маё следства закончана. Абвінавачваннем служыць нарыс Кучара!» Вось узор з таго нарыса: «Творчасць Таўбіна, яго актыўнае ігнараванне нашай рэчаіснасці, захапленне буржуазнай прадажніцкай гнілой культурай, замкненне ў кола сваіх псіхалагічна хворых успрыманняў, рамантычнае эстэцтва — усё гэта вынікае з нянавісці яго, Таўбіна, да дыктатуры пралетарыяту, да нашага сацыялістычнага будаўніцтва».

## «Ці не абрыдла безназоўнасць вам?»

Юлія Таўбіна расстралялі разам з дзясяткамі іншых літаратараў у ноч з 20 на 30 кастрычніка 1937 года. Яму было 26 гадоў. Пасля гэтага выйшла яшчэ некалькі яго перакладаў. У архіве захоўваецца ліст Абеля Ісакавіча Старцава, знакамітага расійскага перакладчыка, вучонага-амерыканіста, напісаны 10 ліпеня 1966 года. Ліст адрасаваны, як я зразумела, Станіславу Пятровічу Шушкевічу, які працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» і, відаць, рыхтаваў творы Таўбіна да друку.

*«Я ни разу не видел Таубина (о чем жалею): только лишь говорил однажды по телефону о работе, которую он выполнял по моей просьбе. Однако я отлично помню и о его ярком даровании поэта-переводчика и о его судьбе.*

*В Москве готовился к изданию роман ирландского писателя Шона О'Фаолэйна «Гнездо простых людей». Я писал предисловие к роману и следил за его переводом. В тексте романа были стихи, нелегкие для перевода; кто-то рекомендовал совершенно мне неизвестного Таубина, студента лит. инта. Я, без особой веры в успех, обратился к нему и был удивлен блеском полученных стихов... Переводчик одинаково свободно чувствовал себя и в сатирическом народном стихе и в лирической балладе и безошибочно передавал тональность подлинника.*

*О, как часто я вижу — опять и опять —*
*Детских дней моих тихий приют...*
*Этих дней и тебя, моя родина-мать,*
*Никогда мне года не вернут.*
*Солнце в море скрывалось,*
*и падала мгла,*
*И закат золотил корабли...*
*Я играл и резвился, под сенью лесной*
*У истоков родимого Ли.*

*Когда книга вышла, Таубин уже был арестован, и фамилия его не была названа. Пользуюсь случаем удостоверить, что перевод стихов принадлежит ему.*

*В дальнейшем я прочитал переводы Таубина из Хаусмана, Синга, Честертона и Мейсфилда, напечатанные в «Антологии новой английской поэзии», вышедшей ранее. Некоторые из них очень хороши. Не сомневаюсь, что как переводчик английской поэзии он занял бы место среди лучших ваших мастеров.*

*Я был очень рад, когда прочитал недавно в «Новом мире» прекрасные стихи Кулешова, посвященные памяти Таубина; я никогда не переставал жалеть о нем».*

А вось радкі са згаданага верша Аркадзя Куляшова «Памяці паэтаў З. Астапенкі і Ю. Таўбіна»:

*«Сябры мае! Пад пустак дыванамі*
*Ці не абрыдла безназоўнасць вам?*
*Дзе дзверы, што замкнуліся за вамі?*
*Як вас знайсці? Якіх пытацца брам?*

*Маўчыць нябыт каменных пліт*
*паважных,*
*Дзе з надпісаў дажджы змываюць пыл,*
*Там я блукаў, але імёнаў вашых*
*Не адшукаў на вокладках магіл.*

*Няма куды сваю жалобу ўскласці*
*Ні жонкам, ні знаёмым, ні бацькам.*
*Сябры мае, хіба аб гэтым шчасці*
*У маладосці марылася нам?*

*Нядоўгім быў ваш век, як век падзёнак,*
*Мае сябры!.. Суровы сівер змёў*
*Са старту вас. Вы — кнігі без старонак,*
*Лісты без дрэў, дарогі без слядоў.*

*Нялёгка мне працягам быць тых самых*
*Няходжаных шляхоў, быць вартым тых*
*Спраў абарваных, кніг недапісаных,*
*Якім не ўзняцца з фінішаў сваіх».*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Культурная прастора



Фота Аляксандра ПУКШАНСКАГА.

# ДВАЙНЫ ЮБІЛЕЙ У КОЛАСАЎСКІМ

**У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа дзве круглыя даты: 95 гадоў заснавання і 80, як там адбыўся першы паказ спектакля «Несцерка», які мае статус візітоўкі тэатра.**



Днём заснавання віцебскага тэатра лічыцца 21 лістапада 1926 года. У Віцебску адкрылі Другі Беларускі дзяржаўны тэатр на базе выпускнога курса Беларускай драматычнай студыі пры знакамітым Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры.

У 1920—1930-я гады існавалі яшчэ два нацыянальныя тэатры: БДТ-1 (будучы Купалаўскі) — у Мінску — і вандроўны, пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка, будучы БДТ-3 — у Гомелі.

«Несцерка» ў Коласаўскім традыцыйна адкрывае чарговы творчы сезон. Так было і сёлета (паказалі 12 верасня). Галоўны герой — чалавек з гумарам, вынаходлівы і добры, выказвае погляды простых людзей. За пастаноўку спектакля Навум Лойтэр разам з выканаўцамі галоўных роляў Аляксандрам Ільінскім (у 1953-м яму прысвоілі званне «Народны артыст СССР») і Цімохам Сяргейчыкам, кампазітарам Ісакам Любанам, а таксама мастацкім кіраўніком тэатра Паўлам Малчанавым у 1946 годзе быў уганараваны Дзяржаўнай прэміяй СССР. У «Несцерку» занята ўся трупа...

А святкаванняў дат, як удакладніў **мастацкі кіраўнік Міхась КРАСНАБАЕЎ**, не будзе. Замест гэтага амаль усе акцёры сыграюць у спектаклі «Ціль» па п'есе Рыгора Горына. Гэта пастаноўка, што цікава, адна з першых Марка Захарава ў «Ленкаме». Галоўны герой — блазан, але можна сказаць, «з сакрэтам». Такія раптам становяцца лідарамі, за імі ідуць людзі, што адбіваецца на іх жыцці. І не заўсёды добра.

У гэтым спектаклі заняты народны артыст Беларусі Тадэвуш Кокштыс — адзін з найстарэйшых працуючых акцёраў свету, якому ў кастрычніку споўніцца 87 гадоў. У віцебскім тэатры ён служыць з 1958-га.

У новым сезоне будзе багата гастрольных паездак. У тым ліку і за мяжу. У прыватнасці, на расійскім фэсце «Ліпецкія тэатральныя сустрэчы» віцябчане пакажуць спектакль «Гульня ў джын». А ў канцы кастрычніка ў беларускім пасольстве ў Маскве — «Шагал... Шагал...».

Тым часам працягваецца замена даху будынка, паведаміў на прэс-канферэнцыі **дырэктар тэатра Аляксандр СТАРЫХ.** Ён адзначыў вялікую падтрымку з боку Міністэрства культуры. Ёсць надзея атрымаць новае светлавое і гукавое абсталяванне.

На жаль, даўняя мара стварыць музей гісторыі тэатра не рэалізавалася. Для таго, каб ён быў, шмат зрабіла народная артыстка Беларусі Святлана Акружная. Нават не верыцца, што гэтай вечна маладой, энергічнай, поўнай творчых планаў жанчыне ў студзені 75...

У тэатры будзе працягнутая традыцыя праводзіць фэст школьных тэатраў. Як падкрэсліў **кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі Алесь ЗАМКОЎСКІ**, абавязковая ўмова для ўдзельнікаў не мяняецца: трэба, каб пастаноўкі былі на беларускай мове. Ужо многія з тых дзяцей і падлеткаў, хто выступаў у Коласаўскім, звязалі свае жыццё з тэатральным мастацтвам, сталі вернымі гледачамі. У любым выпадку, падрыхтавацца да спектакля ў акцёрскай грымёрцы, сыграць пад святлом сафітаў на сцэне, дзе выступаюць прафесіяналы, пачуць парады рэжысёраў, акцёраў, адчуць тэатр знутры — такое не забываецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Запрашальнік

# ВОСЕНЬ У ЗАВОССІ

## Музей-сядзіба Міцкевічаў ладзіць восеньскі фэст

**Пакуль яшчэ трымаецца добрае надвор'е, трэба максімальна выкарыстаць апошнія цёплыя дні. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прапаноўвае наведаць вёску Завоссе. Для тых, хто чуе гэтую назву ўпершыню, распавядаем: Завоссе — малая радзіма паэта Адама Міцкевіча. У сядзібе прайшло яго дзяцінства, але і потым, з цягам часу, Міцкевіч неаднойчы вяртаўся сюды. Тут складаў узнёслыя вершы, тут расквітнела ягонае самае гарачае і нешчаслівае каханне — да Марылі Верашчакі... Барацьба за сядзібу — са шляхецкімі наездамі, судамі, сямейнымі інтрыгамі — адлюстравалася ў паэме «Пан Тадэвуш».**

Літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі» пройдзе 16 кастрычніка. Зразумела, што трапіць у музей тым, хто не мае ўласнага аўто, будзе складана. Таму наведвальнікам прапаноўваюцца адразу два тыпы квіткоў: з праездам Мінск — Завоссе — Мінск і звычайныя, без трансферу.

У праграму фестывалю ўваходзяць аніміраваныя экскурсіі па сядзібе, інтэрмедыі старажытнага лялечнага тэатра «Батлейка», інтэрактыўныя пляцоўкі і квэсты. Таксама можна будзе пачаставаца гарбатай і ўзяць удзел у розных майстар-класах. Усё гэта пройдзе ў атмасферы шляхецкага двара другой паловы XVIII стагоддзя — такім чынам можна пазнаёміцца з сямейным побытам Міцкевічаў.




Адметна і тое, што «Восень у Завоссі» будзе арганізавана так, каб зацікавіць наведвальнікаў рознага ўзросту. Таму ехаць туды можна ўсёй сям'ёй — кожны знойдзе адпаведную для сябе актыўнасць.

Квіткі ўжо даступныя для заказу, арганізатары раяць сачыць за навінамі фестывалю ў сацыяльных сетках.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# КВЭСТ У ПАРКУ «ПЕРАМОГА»

## Маладзечанская бібліятэка з дапамогай гульні расказвае пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны

**Прагульваючыся ў гарадскім парку Маладзечна, цяпер час ад часу можна назіраць цікавае відовішча: купкі маладых людзей альбо падлеткаў з аркушыкамі ў руках нешта горача абмяркоўваюць, бягуць, спыняюцца перад нейкімі аб'ектамі з радаснымі выкрыкамі... Не дзівіцеся, бо калі даведаецеся, у чым справа, самім захочацца далучыцца.**



Пра вельмі важныя для выхавання патрыятычныя рэчы можна расказваць дзецям і моладзі нефармальна і захапляльна... Гэта чарговы раз пацвердзілі супрацоўнікі Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Багдановіча, якія ў межах праекта «Ідзі і глядзі» распрацавалі асаблівы квэст — «Былых гадоў жывая памяць». Ён карыстаецца вялікім попытам і ў школьнікаў, і ў студэнтаў, і ў людзей старэйшых...








— Квэст праводзіцца на тэрыторыі гарадскога парку «Перамога», — распавядае **дырэктар бібліятэкі Марыя СТАСЯЛОВІЧ.** — Там вельмі шмат тэматычных помнікаў, і мы вырашылі з іх дапамогай пазнаёміць нашых чытачоў з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, з гісторыяй горада і роднай Беларусі. І, павінна сказаць, у нас амаль аншлаг. Праходзілі квэст навучэнцы Маладзечанскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа імя І. В. Залуцкага і політэхнічнага каледжа, прадстаўнікі Маладзечанскай арганізацыі БРСМ, звярталіся да нас і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, і школы, прычым не толькі гарадскія, але і з раёна.

Гульцы атрымліваюць спіс заданняў і маршрутны ліст ды рухаюцца па пунктах. Гульня разлічана прыблізна на сорак хвілін. Трэба прайсці сем аб'ектаў. Квэст пачынаецца ад галоўнага ўвахода ў парк. Давядзецца пабываць у Алеі гарадоў, дзе праходзілі Дажынкі, у алеі Герояў Савецкага Саюза, жыццё і дзейнасць якіх звязаныя з Маладзечаншчынай, і нават успомніць, якія жывёліны дапамагалі савецкім войскам і партызанам у гады Вялікай Айчыннай вайны... Не абыходзіцца без тэмы знакамітага Маладзечанскага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Шукаць адказ на адно з заданняў давядзецца ў амфітэатры, дзе адбываліся важныя падзеі гэтага музычнага фэсту. Каб выканаць заданне, трэба не проста дабрацца да пэўнага аб'екта, але праявіць назіральнасць і кемнасць. У квэсце ёсць інтрыга, бо гэта камандная гульня — звычайна ўдзельнічаюць па дзве каманды. Пераможцы атрымліваюць ад бібліятэкі дыпломы. Напрыклад, калі спаборнічалі навучэнцы політэхнічнага каледжа, каманда «Васількі» перамагла каманду «Кветкі» з перавагай у чатыры балы.

Каб далучыцца да гульні, трэба звярнуцца ў бібліятэку, умовы можна пачытаць на яе сайце і на сайце Маладзечанскага гарвыканкама.

**Святлана ПЯТРОВА.**



У Мінску адкрылася выстаўка-продаж работ маладых мастакоў Беларусі «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам — 2021». Знайсці мастацтва даспадобы тут зможа і аматар рэалістычнага жывапісу, і прыхільнік яркага сучаснага партрэта, і знаўца ўнікальнай скульптуры. Выстава ўражвае маштабамі — больш за 400 работ мастакоў з Мінска, Брэста, Гомеля, Жлобіна і іншых гарадоў краіны размясцілася ў трох залах Палаца мастацтваў (вул. Казлова, 3).

Мэтай выстаўкі арганізатары называюць папулярызацыю мастацтва, і знаёмства гледача з работамі маладых беларускіх мастакоў. І, мяркуючы па колькасці наведвальнікаў, «Восеньскі салон» паспяхова выконвае сваю місію. Тут, у Палацы мастацтваў, можна сустрэць дасведчаных калекцыянераў, натхнёных пачаткоўцаў і нават стваральнікаў выстаўленых работ.

Упадабаную карціну, фатаграфію або скульптуру можна забраць дадому. Цэны на творы розныя: ад двух рублёў да некалькіх тысяч. Выстаўка будзе працаваць да 31 кастрычніка. Раім вылучыць на сузіранне пару гадзін — беларускае мастацтва шматграннае і цікавае.

**Аліна МАЗАВЕЦ, фота аўтара.**

# ФАРБЫ І АСОБЫ «ВОСЕНЬСКАГА САЛОНА»











**Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк**

# «БСБ Банк»

www.bsb.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2021 года

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | На 01 октября 2021 г. | На 01 января 2021 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 37 607 | 35 969 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 20 233 | 20 147 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 40 543 | 33 725 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 81 204 | 91 390 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 106 883 | 121 290 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 45 396 | 27 742 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 782 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 29 007 | 28 393 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | 1 925 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 99 | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 12 922 | 7 522 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 374 711 | 368 138 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 47 | 4 003 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 310 242 | 299 571 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 944 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | 19 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 5 238 | 7 089 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 315 527 | 311 626 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 21 684 | 22 900 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 8 554 | 7 707 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 18 767 | 19 351 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 10 179 | 6 554 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 59 184 | 56 512 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 374 711 | 368 138 |

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках
на 1 октября 2021 года

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | На 01 октября 2021 г. | На 01 октября 2020 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 9 498 | 8 276 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 509 | 1 263 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 7 989 | 7 013 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 21 313 | 18 319 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 10 256 | 8 636 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 11 057 | 9 683 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 149 | 80 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (520) | 28 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 10 096 | 16 067 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 1 819 | (2 590) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | (1 385) | 641 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 5 147 | 1 133 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 23 776 | 21 220 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 920 | 757 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 12 426 | 8 796 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 123 | 1 412 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 10 303 | 7 384 |

Председатель Правления Дубков С.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Дата подписания: 11 октября 2021 г.

УНП 807000069

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона, оператор ЭТП | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| Продавец | **ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я Коласа, 28** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 801 | Капитальное строение, 622/С-46405 | 31 428,00 |
| 802 | Капитальное строение, 622/С-46404 | 27 324,00 |
| 803 | Капитальное строение, 662/С-46902 | 17 280,00 |
| 804 | Капитальное строение, 662/С-46903 | 14 256,00 |

**расположенный по адресу:** Минская обл., Столбцовский р-н

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота.

